*А. Г. ФЯДОТАЎ*

# ТЭАТРАЛІЗАВАНЫЯ ПАЛЯВАННІ БЕЛАРУСКАЙ ШЛЯХТЫ XVII – XVIII стст. ЯК ПАРАТЭАТРАЛЬНЫЯ ДЗЕІ

*Разглядаюцца традыцыі бытавання і эвалюцыя на землях ВКЛ у XVII–XVIII стст. старажытнай забавы вялікіх князёў, магнатаў і шляхты – палявання, яго кампазіцыйная пабудова, рытуалістыка і выразныя сродкі як яскравай тэатралізаванай дзеі. Звяртаецца ўвага на магчымасць выкарыстання тэатралізаваных элементаў старажытнай забавы ў практыцы пастаноўкі сучасных святкаванняў.*

Перыяд надання Беларусі статусу суверэннай дзяржавы адзначаны хваляй грамадскай цікавасці да здабыткаў айчыннай культуры, якія доўгі час знаходзіліся пад забаронай. Да прац А.Мальдзіса, А.Грыцкевіча, Г.Барышава далучаецца шэраг работ, у якіх айчынныя гісторыкі, этнографы і мастацтвазнаўцы М.Ткачоў, В.Дадзіёмава, А.Бельскі, К.Тарасаў, У.Арлоў, І.Сагановіч, Г.Саверчанка, П.Гуд, А.Кілбас і іншыя даследуюць феномен шляхецкай культуры. Сёння гэтая цікавасць з навуковых кабінетаў выходзіць у шырокія колы грамадства і знаходзіць сваё практычнае ўвасабленне ў розных галінах культурнага жыцця нашай краіны. Урачыстасці (ці асобныя эпізоды), пабудаваныя ў выглядзе шляхецкага балявання, тэатралізаванага застолля, рыцарскага адзінаборства, насычаныя адпаведнай атрыбутыкай (гербамі, штандарамі, маршальскімі булавамі і інш.), а таксама гульнямі і забавамі шляхты, усё часцей выкарыстоўваюцца пастаноўшчыкамі ў святах разнастайнай тэматычнай накіраванасці. Адной з такіх забаў вялікіх князёў, магнатаў і шляхты, у якой найбольш яскрава праяўляўся дух жыхароў лясных мясцін Вялікага княства Літоўскага і характар шляхціца-ваяра, з'яўлялася паляванне. У навуковай і навукова-папулярнай літаратуры паляванне разглядалася як старадаўні промысел (Н.Александровіч, Г.Карцаў, Я.Вішнякоў, М.Генко, А.Далматаў, С.Цярохін), як шляхецкая забава з элементамі тэатралізацыі і музыкі (А.Мальдзіс, Г.Барышаў, В.Дадзіёмава). Сёння ёсць магчымасць даследаваць структуру і выразныя сродкі шляхецкіх паляванняў XVII – XVIII стст., здольных (у працяг старажытнай традыцыі) выконваць ролю тэатральнага аздаблення сучасных паляванняў у Белавежы.

Звязанае з уменнямі валодаць рознымі відамі халоднай і агнястрэльнай зброі, высочваць звера, рабіць засады, выяўляць моц духу, адвагу і смеласць паляванне было вельмі набліжана да галоўнага грамадскага прызвання шляхціца-рыцара – бітвы з ворагам. У сістэме шляхецкай культуры паляванне выконвала дзве галоўныя функцыі: набыцця і ўдасканалення вайсковых ведаў і навыкаў, а таксама – забавы, якая была формай праяўлення пануючага становішча шляхты. Паляванне з'яўлялася выключна шляхецкай забавай. Прадстаўнікам іншых саслоўных груп самастойнае паляванне на буйную жывёлу забаранялася; яны далучаліся да ўдзелу ў аблавах толькі ў якасці памагатых. Звычайна палявалі з гончымі, з аблавай, ставячы сеткі (на мядзведзя), значна радзей з сокаламі. Сакалінае паляванне было не толькі самым вытанчаным заняткам, але і самым дарагім. Валоданне сокалам лічылася другой, пасля шаблі, прыметай прыналежнасці да шляхецкага саслоўя. За добра вывучанага сокала кароль Стэфан Баторый даваў "двух добрых коней ці трох выгадаваных валоў" [1, с. 61], а добры паляўнічы сабака (згодна параўнальнага аналізу артыкулаў Статута ВКЛ 1588 г.) каштаваў даражэй за буйную рагатую жывёлу.

Першыя рысы тэатралізацыі прасочваюцца ў паляваннях часоў вялікага князя Вітаўта, які надае ім характар сапраўдных ваенных манеўраў. У мэтах падрыхтоўкі ўмелых ваяроў князь Вітаўт наладжваў "лагер ваенны пры кожным паселішчы ў пушчах" [2, с. 247]. Падчас палявання на буйнога звера ва ўмовах рэальнай, а не вучэбнай небяспекі ваяры князя Вітаўта загартоўвалі рыцарскі дух і выпрацоўвалі вайсковыя прыёмы.Ператворанае ў своеасаблівы вайсковы турнір паляванне часоў князя Вітаўта падзялялася на дзве часткі. Першая складалася з паланення зубра, дзеля чаго ў лесе з "бярвення-калодаў" будавалася спецыяльная "сценка" ў выглядзе клешчаў, куды зубра заманьваў спецыяльны лавец-завадатар у чырвонай вопратцы з шабляй. Раз'юшаны чырвоным колерам вопраткі і бляскам клінка завадатара зубр кідаўся наперад і трапляў у драўляную пастку, выхад з

якой адразу перакрываўся ваярамі. Пасля спутанаму вяроўкамі зубру прадзявалі ў пысу жалезнае кальцо з пастромкам і вялі да ваеннага лагера. Па сведчанні аўтара "Песні пра зубра", гэтая пераможная працэсія збірала "шпалеры цікаўных" гледачоў [2, с. 253]. Непасрэдна ў лагеры пачыналася другая частка манеўраў, калі пушчаны ў поле і памечаны "кропкамі, як рабаціннем" зубр ператвараўся ў сапраўдную бегавую мішэнь для лучнікаў і капейшчыкаў княжацкай кавалерыі.

Гучна ражок затрубіў – і пайшла адшліфоўка
Трапнай стральбы і бяспромашных закідаў коп'яў [2, с. 253].

Легенды сведчаць, што кожны з ваяроў значыў стралу ці кап'ё спецыяльнай зарубкай, каб апазнаць свой удар. Самую высокую ўзнагароду ад князя атрымліваў той, хто смяротна раніў жывёліну.

Прыведзеныя прыклады дазваляюць заўважыць, што падчас гэтага своеасаблівага вайсковага турніру выкарыстоўваліся аказіянальная архітэктура ("сценка"), касцюміраванне і бутафорыя (чырвоная накідка і шабля лоўчага-завадатара, малюнкі-мішэні на целе зубра), музычнае афармленне (гукі ражка), стыхійна з'яўляліся першыя гледачы. Гэта сведчыць аб парастках відовішчных элементаў у шляхецкім паляванні. Яны надавалі звыкламу паляванню новую якасць, характэрную для паратэатральных дзей.

Больш значнай трансфармацыі гэта шляхецкая забава дасягнула ў гады праўлення Аляксандра Ягелончыка (1492–1506), калі ловы атрымліваюць статус каралеўскага палявання. Цяпер на аблаву зубра выязджае ўвесь каралеўскі двор. Для высокіх гасцей будуюцца спецыяльныя глядацкія месцы, узнятыя над зямлёй брусавымі апорамі для больш зручнага назірання. Спецыяльна да пляцоўкі з гледачамі гоніцца зубр, і перад вачыма публікі адбываецца небяспечнае і ў той жа час шчыра тэатральнае відовішча – адзінаборства з дзікай жывёлай. На пляцоўку перад памостам з высакароднымі гледачамі выходзіў найбольш смелы і падрыхтаваны ваяр і ўступаў у адзінаборства з зубрам. Аховай яму служылі толькі нешматлікія дрэвы на пляцоўцы, выдатная рэакцыя і адмысловае валоданне прыёмамі фехтавання, паколькі зваліць ляснога волата мог толькі дакладны ўдар клінком пад лапатку.

Паляванне на буйнога звера (мядзведзя, дзіка, лася, зубра) было самым ганаровым, але далёка не бяскрыўдным спортам. Сустрэча з раз'юшаным аблавай зверам патрабавала ад паляўнічых вялікай фізічнай сілы, умення і адвагі. Вельмі часта паранены звер кідаўся на паляўнічага, раніў яго, а здаралася, што і забіваў разам з канём. Крыніцы захавалі звесткі аб выпадку, калі падчас тэатралізаванай забавы ахвярай раз'юшанага зубра ледзь не сталі высокія госці вялікага князя Аляксандра, сярод якіх знаходзілася і яго жонка, дачка Івана III – Алена. Але, нягледзячы на вялікую небяспеку, паляванне захоўвала за сабой статус забавы, якая вельмі часта збірала гледачоў самага высокага ўзроўню. У гэтым адлюстроўваўся менталітэт шляхецкага вайскова-служылага саслоўя. Гатоўнасць у любы момант да смерці кампенсавалася ў сапраўднага шляхціца-ваяра абвостранай прагай жыцця, часам вельмі кароткага, з усімі яго задавальненнямі і ўцехамі, якім прысвячаліся нядоўгія перапынкі паміж войнамі. Паляванне ўяўляла сабой своеасаблівы тэатр, у якім месца для бітвы, засценкі для загону зубра і спецыяльныя памосты на сваях для гледачоў былі штучнымі, прыстасаванымі для відовішча, а ўсе калізіі дзеяння і нават смерць ваяра-"гладыятара" былі сапраўднымі. Нездарма М.Гусоўскі вуснамі апавядальніка "Песні пра зубра" параўноўвае аблаву на гэтага звера з іспанскай карыдай: "Як на арэне, сыходзяцца роўныя сілы" [2, с. 255].

Сярод уладароў наступных стагоддзяў вялікую ўвагу паляўнічай забаве ўдзялялі Жыгімонт І Стары, Стэфан Баторый, Уладзіслаў IV, Аўгуст III і нават "аматар прыгожых мастацтваў", апошні кароль Рэчы Паспалітай Станіслаў Аўгуст Панятоўскі. Па сцвярджэнні польскіх даследчыкаў, "з прыхільнасцю да палявання не маглі канкурыраваць ані найпрыгажэйшая нявеста, ані найбагацейшы пір; пры ўпаміне аб паляванні забывалася ўсё на свеце" [3, с. 107].

З вялікай світай выязджаў на паляванні Жыгімонт І Стары. У мястэчку Нарэўка для караля быў пабудаваны спецыяльны паляўнічы дом. Прыхільнасць да палявання прымусіла Стэфана Баторыя адразу па атрыманні польскай кароны ў 1575 г. перанесці сваю рэзідэнцыю ў Гародню (нягледзячы на настойлівыя спробы магнатаў і вышэйшага святарства ўтрымаць караля ў Варшаве). Для задавальнення паляўнічага азарту Стэфан

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Баторый загадвае пабудаваць “паляўнічы замак у населеным пункце Белавежа... і каралеўскі звярынец пры крыніцах Еляркі” [4, с. 66].

Найбуйнейшае каралеўскае паляванне адбылося ў Белавежскай пушчы 27 верасня 1752 г. З нагоды атрымання ордэна св. Губерта (апекуна паляўнічых) Аўгуст III правёў на паляванні шэсць тыдняў! На паляванне, якое рыхтавалі нямецкія паляўнічыя, Аўгуст III прыбыў з каралевай, каралевічамі і вялікай світай магнатаў і шляхты. Аб прыбыцці караля і пачатку палявання абвясцілі гукі паляўнічых ражкоў. У спецыяльна пабудаванай альтанцы размясціліся каралеўская сям’я і найбуйнейшыя саноўнікі. У адстрэле разнастайных звяроў, якіх гналі на паляўнічых загоншчыкі, удзельнічала і каралева. Начыненую зброю падносілі пажы ці каралеўскія егеры. Пасля кожнага ўдалага стрэлу па зубры гучалі ўрачыстыя фанфары. Па заканчэнні паляўнічага дня каралеўская сям’я ацэньвала штрэку.

Штрэка (урачысты агляд забітай дзічыны) з’яўлялася кульмінацыяй ловаў і мела ў Белавежы традыцыйную форму правядзення. Па тэатралізацыі яна не саступала агульнай атмасферы гэтага паляўнічага спектакля. Увечары ўсе забітыя за дзень дзікія жывёлы звозіліся на вялікую паляну ці на плошчу перад княжацкім замкам, дзе лоўчыя размяшчалі іх у пэўным парадку. Строгая рытуалізацыя каралеўскіх паляванняў распаўсюджвалася нават на забітую жывёлу, якая размяшчалася згодна пэўнай іерархіі. Першы рад займала дзічына, забітая каралём ці вялікім князем, яна ляжала па відах: спачатку зубры, пасля ласі, алені, лісы, зайцы і г.д. Дзічына, забітая астатнімі ўдзельнікамі ловаў, складала другі рад (з тым жа падзелам на віды). Забітыя звяры ўпрыгожваліся гірляндамі з дубовых галінак. Да прыбыцця высокіх гасцей уся паляўнічая каманда станавілася па-за радамі забітага звера з палаючымі паходнямі; па баках паўколам стаялі дваровыя людзі. Па прыбыцці высакародных паляўнічых зноў гучалі ўрачыстыя фанфары, і кіраўнік ловаў уручаў каралю ведамасць аб выніках палявання. Стоячы справа ад штрэкі, ён аголеным паляўнічым нажом указваў на забітага зубра, і ў той жа момант гучала ўрачыстая фанфара забітаму. Спецыяльнымі музычнымі сігналамі акцэнтаваўся агляд і іншых відаў звяроў, пасля чаго аглядалася ўся штрэка. Штрэка збірала амаль што ўвесь Белавеж, прыязджалі нават з навакольных гарадоў і вёсак. Завяршаўся паляўнічы дзень урачыстай вячэрай у замку. Шматлікія арганізатары ловаў, якія атрымлівалі частку забітай дзічыны і пітво, наладжвалі частаванне на вольным паветры.

З нагоды палявання караля Аўгуста III у 1752 г., згодна з апісаннем А.Кіркора, “на правым беразе ракі Нарэўкі быў усталяваны помнік у выглядзе трохкутнай піраміды ў 6 аршын вышынёй з надпісам, які абвяшчаў, што кароль разам з каралеваю і сынамі забілі 42 зубры, 13 ласёў і 2 сарны” [4, с. 66].

Падобнасць азначаным ловам да тэатральнага відовішча надавалі розныя аказіянальныя пабудовы: альтанкі, памосты для гледачоў, штанды (маленькія зачыненыя галерэі для паляўнічых), а таксама наяўнасць вялікай колькасці гледачоў палявання, асабліва падчас штрэкі. Спецыяльна створаная музыка для паляўнічых ражкоў і фанфар акцэнтавала асобныя эпізоды гэтага паляўнічага спектакля, абвяшчаючы прыбыццё высокіх асоб, пачатак і заканчэнне ловаў, час руху наперад, каманду да стрэлаў і нават вызначала хуткасць, з якой трэба гнаць звера. Дадзеныя паляванні-спектаклі адбываліся па дакладна распрацаваным сцэнарыі, у якім кожны ўдзельнік ведаў сваё месца і ролю.

Каралеўскія і вялікакняжацкія ловы патрабавалі грунтоўнай арганізацыі і падрыхтоўкі, якую здзяйсняла вялікая колькасць людзей. Акрамя лоўчых, падлоўчых, стральцоў і асочнікаў, былі птушнікі, сакольнікі, палёўнікі, сетнікі, катлавыя, сабакары і інш. Да палявання прымусова далучаліся сотні сялян навакольных вёсак у якасці загоншчыкаў “клікуноў” і “гучкоў” [5, с. 110]. Акрамя гэтага, у іх абавязкі ўваходзілі ўзвядзенне спецыяльных лоўчых пабудоў, агарож, забеспячэнне ежай сабак і сокалаў.

Магнаты і шляхта наладжвалі і прыватныя паляванні на сваіх землях. Дыярыюшы М.К.Радзівіла ўтрымліваюць шматлікія звесткі аб прыватных паляваннях: ”Увесь дзень паляваў на сарны” [6, с. 130]; “З раніцы ездзіў з аблаваю і забіў мядзведзя”; “Па імшы ездзіў у поле на Губертавіны [дзень св. Губерта – апекуна паляўнічых] і дваццаць зайцаў ушчучыў” [7, с. 58, 60].

Найбольш рэпрэзентатыўнымі ў рэчышчы разглядаемай праблемы былі зборныя ловы магнатаў, якія часам не саступалі каралеўскім і вялікакняжацкім. Гэтым паляванням

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

папярэднічала афіцыйнае запрашэнне гаспадара ловаў, якое развозіў пакаёвы дваранін. Так, на запрашэнне вялікага аматара палявання (таксама кавалера ордэна св. Губерта) Караля Радзівіла збіраліся прадстаўнікі буйнейшых магнацкіх родаў Рэчы Паспалітай. Калі радзівілаўскі замак не змяшчаў усіх Сапегаў, Агінскіх, Пацаў, Ржавускіх, Чапскіх, Любамірскіх, Сангушкаў і іншых, яны спыняліся на пастой у горадзе. Пакуль з'язджаліся высакародныя паляўнічыя ў поле, за горадам у шалашах размяшчаўся абоз са стральцоў, лоўчых, ашчэпнікаў і сялян, сагнаных на аблаву.

Выезду на паляванне папярэднічаў агляд усіх удзельнікаў ловаў, узброеных халоднай і агнястрэльнай зброяй. Да зброі ставіліся вельмі сур'ёзна (ад яе залежала жыццё) і набывалі як з пункту гледжання надзейнасці, так і, згодна з норавамі эпохі, па прыгажосці знешняга аздаблення. Чаканка і разьба, што ўпрыгожвалі зброю, выконвалі ролю своеасаблівага тэатральнага дэкору – “курок рабілі ў выглядзе сірэны, крэсіва – кіпцюрыстай лапы каршуна, засаўку паліцы – раз'юшанай лічыны (твару чалавека або пашчы драпежнага звера”) [8, т. 1, с. 89].

Шляхецкія паляванні другой паловы XVIII ст. сведчаць аб заняпадзе рыцарскіх традыцый, уласцівых ловам мінуўшчыны, і часцей вылучаюцца звесткамі аб “подзвігах” застольных, чым паляўнічых. Знакамітыя аблавы часоў Вітаўта патрабавалі сапраўднай мужнасці, адвагі і спрыту, а яскрава тэатралізаваныя паляванні XVIII ст. сучаснікі называлі “карыкатурай на сапраўдныя паляванні” [3, с. 102]. Вельмі часта звяроў на ловы дастаўлялі ў клетках і выпускалі проста пад стрэлы высакародных паляўнічых. Існавалі выпадкі, калі “звяроў рознымі спосабамі вымушалі падскокваць, каб іх можна было біць у скачку” [3, с. 102]. Шляхта выязджала на ловы, толькі калі звер загнаны лоўчымі. У канцы XVIII ст. у любімай шляхецкай забаве яскрава адлюстроўваецца заняпад калісь моцнай дзяржавы – Рэчы Паспалітай.

Шматвекавая традыцыя палявання стварыла своеасаблівую паляўнічую субкультуру. Перад вялікімі паляваннямі звычайна адпраўлялі імшу, падчас якой звярталіся да апекуна паляўнічых св. Губерта і прасілі яго аб дапамозе. Існавалі “спецыяльныя замовы для зброі”, здаралася, што “кулі адлівалі пад абразамі святых” [3, с. 103]. Па меркаванні ўдзельнікаў ловаў, для палявання існавалі спрыяльныя, добрыя дні, таму яны скрупулёзна вылічваліся, каб пазбегнуць дзён нядобрых. Паляўнічы занятак нарадзіў шэраг вершаў, песень, прыслоўяў, загадак, фрашак (*польск.* – кароткіх жартоўных вершаў). Літаратурная спадчына Францішкі Уршулі Радзівіл утрымлівае “Верш да Яснавяльможнага князя, які выпраўляецца на паляванне” [9, с. 59], адрасаваны мужу − М.К.Радзівілу, заўзятаму аматару палявання. Паляванні нарадзілі вялікую колькасць музычных твораў, частка якіх насіла сігнальна-інфарматыўны характар, а некаторыя прадстаўлялі сабой каштоўнасць як з'ява мастацтва. Па сцвярджэнні музыказнаўцаў, паланез Мацея Радзівіла “Паляванне” ўтрымліваў дакладныя рэмаркі аб ходзе падзей, пачынаючы ад “галопа гарэзлівай лані” да далейшых “траўлі звера”, “адзінаборства з мядзведзем”, яго “смяртэльнай агоніі” і “трыумфу паляўнічых” [10, с. 52].

Рэтраспектыўны агляд шляхецкіх паляванняў XVII – XVIII стст. дазваляе зрабіць наступныя высновы-рэкамендацыі.

Шляхецкія паляванні XVII – XVIII стст. – тыповая з'ява паратэатральнай культуры, у якой факты жыцця спалучаюцца з элементамі мастацтва.

Азначаныя паляванні ўтрымліваюць шэраг рытуалаў і тэатралізаваных эпізодаў, насычаных маляўнічай тэатралізацыяй, музыкай і паляўнічымі сігналамі, аказіянальнай архітэктурай, якія пры рэжысёрскім асэнсаванні здольны стаць яскравымі святочнымі дзеямі сучаснага свята.

Вывучэнне і асэнсаванне рытуалістыкі, кампазіцыйнай пабудовы і выразных сродкаў тэатралізаваных паляванняў мінуўшчыны дазволяць сучасным пастаноўшчыкам ствараць яскравыя святочныя эпізоды свят, пабудаваныя на гістарычна нацыянальных традыцыях.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

---

1. *Лемнис, М. В* старопольской кухне и за польским столом / М.Лемнис, Г.Витри. – Вроцлав: Интерпресс, 1999. − 294 с.

2. *Гусоўскі, М.* Песня пра зубра // Старажытная беларуская літаратура / М.Гусоўскі. – Мн.: Юнацтва, 2002. – 509 с.

*3. Kuchowicz, Z.* Obyczaje i postacie Polski szlacheckiej XVI–XVIII wieku / Z.Kuchowicz. – Warszawa: Wydawnictwo Polonia. POLARTIS SA, 1993. – 285 s.

*4. Живописная* Россия. Отечество наше в его земельном, историческом, племенном, экономическом и бытовом значении: Литовское и Белорусское Полесье: репринтное воспроизведение изд. 1882 г. – Мн.: БелЭн, 1993.− 550 с.

*5. Терёхин, С.Ф.* Охота в Белоруссии / С.Ф.Терехин. – Мн.: Полымя, 1980. – 160 с.

*6. Дыярыюш* князя Міхала Казімера Радзівіла Ваяводы Віленскага, Гетмана Вялікага В.К.Літ. // Спадчына. – 1995. – № 3. – С. 100–137.

*7. Дыярыюш* князя Міхала Казімера Радзівіла Ваяводы Віленскага, Гетмана Вялікага В.К.Літ. // Спадчына. – 1995. – №1. – С. 52–65.

*8. Беларусы*: у 8 т. / рэдкал.: В.К.Бандарчык [і інш.]; Ін-т мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору АН Беларусі. – Мн.: Навука і тэхніка, 1995. – Т. 1: Прамысловыя і рамесныя заняткі. – 351 с.

*9. Радзівіл, Ф.У.* Выбраныя творы / Ф.У.Радзівіл. – Мн.: Беларускі кнігазбор, 2003. – 448 с.

*10. Дадиомова, О.В.* Музыкальная культура городов Белоруссии в XVIII в. / О.В.Дадиомова. – Мн.: Навука і тэхніка, 1992. − 207 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ